Разрабатывая систему национальных интересов в области внешней политики, Беларусь учитывает главные тенденции современного европейского развития, оказывающие прямое влияние как на внутреннюю, так и на внешнюю политику страны. К числу названных тенденций следует, в первую очередь, отнести политику расширения Европейского союза и расширения НАТО на Восток.

Превращение Беларуси в непосредственного соседа Евросоюза требует от обеих сторон новых подходов в экономическом взаимодействии. Необходима выработка оптимальной модели плодотворного сотрудничества Евросоюза и Беларуси. Эта модель должна основываться на взаимном экономическом интересе, общности цивилизационных процессов, принадлежности к европейской культуре, единстве истории и географического пространства.

Предметом особой заботы белорусской дипломатии являются взаимоотношения нашей страны с НАТО, которая вплотную подошла к белорусским границам.

Пока еще глобализация – это новый и мало изученный этап мировой истории. Не совсем понятно, в чьих интересах она проводится и какие силы стоят за этими процессами. И финансовый кризис, который охватил все страны мира, скорее всего, является последствием процесса глобализации.

В условиях глобализации национальные интересы любого цивилизованного государства при формировании внешней политики являются фундаментальной основой обеспечения жизнедеятельности государства. Способность страны отстаивать свои национальные интересы определяется экономическим потенциалом, проведением экономических реформ.

## АБ НОВЫХ МОМАНТАХ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ А.Г. ЛУКАШЭНКІ

***Снапкоўскі У. Е.***, *Беларускі дзяржаўны універсітэт*

У гісторыі больш чым 15-гадовай дзейнасці А. Лукашэнкі на пасадзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь другая палова 2008–2009 гг. зоймуць асобнае месца. У гэты час беларускі кіраўнік зрабіў першыя заўважальныя крокі па змяненні сваёй унутранай і знешняй палітыкі. Невядома, ці застануцца гэтыя крокі першымі і апошнімі, ці за імі пойдуць больш значныя перамены. Хутчэй за ўсё, аднак, што значных змен не адбудзецца, паколькі гэта можа пагражаць існаванню сёняшняй беларускай палітычнай і эканамічнай сістэмы. Тым не менш, нават таго, што зроблена, дастаткова для асцярожных сцвярджэнняў аб адыходзе ад ранейшага курсу дзяржаўнай палітыкі.

Патрэба ў пераменах пачала выспяваць пасля прэзідэнцкіх выбараў 2006 г., калі Захад яшчэ больш узмацніў палітыку ізаляцыі беларускіх афіцыйных улад. Але апошнія ўжо прызвычаіліся да гэтай палітыкі, якая па сутнасці не магла дасягнуць пастаўленых мэт – прымусіць беларускага прэзідэнта змяніць сваю ранейшую ўнутраную палітыку. Не Захад быў і застаецца галоўнай прычынай новых веянняў у беларускай палітыкі. Галоўнай прычынай, на мой погляд, была Расія. А. Лукашэнка хацеў бы захаваць ранейшую мадэль адносін паміж Беларуссю і Расіяй, што сфарміравалася яшчэ ў першыя гады яго прэзідэнцтва, і нават раней, пры прэм'ер-міністры В. Кебічы ў часы парламенцкай рэспублікі. Сутнасць гэтай мадэлі можна акрэсліць наступным чынам: танныя расійскія энерганосьбіты і ёмісты расійскі рынак узамен за знешнепалітычную лаяльнасць і ваенна-палітычны саюз з Расіяй.

Аднак гэтая мадэль, якая паспяхова працавала пры прэзідэнце Б. Ельцыне, перастала задавальняць яго наступніка У. Пуціна, які хацеў спыніць дэкларацыйныя інтэграцыйныя праекты і паставіць адносіны з Беларуссю на прагматычную, рынкавую аснову. Гэта была яго праграма-мінімум. А праграма-максімум заключалася ў канчатковым і поўным выкананні Дагавора аб стварэнні саюзнай дзяр-

жавы (фактычна ў інкарпарацыі Беларусі ў склад Расійскай Федэрацыі). І калі гэты момант ісціны раскрыўся ў выглядзе пуцінскай формулы «мух і катлет», беларускі прэзідэнт вымушаны быў даць задні ход сваёй «палітыцы яднання», паколькі яе рэальнае ажыццяўленне азначала б канец беларускай дзяржаўнасці і яго незалежнага прэзідэнцтва.

У. Пуцін на працягу двух прэзідэнцкіх тэрмінаў імкнуўся паламаць моцную інерцыйную традыцыю ранейшых датацыйных адносін з Беларуссю і перавесці іх на больш-менш узаемавыгадную аснову. Але самае большае, чаго ён дасягнуў, — гэта эканамічныя пагадненні з Беларуссю, падпісаныя ў снежні 2006 — сакавіку 2007 г. Аднак і яны не вытрымалі выпрабаванне часам, і Расія зноў была вымушана адысці ад свайго курса на эканамізацыю адносін з Беларуссю. Тым не менш, абмежаванне, а ў перспектыве і гіпатэтычная магчымасць спынення расійскіх датацый існуючай беларускай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сістэмы, уяўляла сабой самы сур'ёзны выклік для А. Лукашэнкі. Трэба было шукаць знешнепалітычныя альтэрнатывы курсу на «інтэграцыю з Расіяй» шляхам паступовага памяншэння эканамічнай і палітычнай залежнасці ад яе.

Яшчэ ў канцы 1990-х гг. быў абвешчаны курс на «шматвектарную» знешнюю палітыку, за якім хавалася імкненне да пошуку новых саюзнікаў сярод краін Азіі, а пазней Лацінскай Амерыкі. Аднак і гэты курс на дыверсіфікацыю перш за ўсё гандлёва-эканамічных сувязей ніякім чынам не мог замяніць расійскага рынку і энерганосьбітаў. Адзінай рэальнай альтэрнатывай праекту «саюзнай дзяржавы» з Расіяй магла стаць палітыка нармалізацыі і наступнага развіцця палітычных і эканамічных адносін з Еўрапейскім саюзам.

23 ліпеня 2009 г. А. Лукашэнка выступіў з дакладам перад кіраўнікамі замежных устаноў Беларусі. Ён падкрэсліў, што беларуская знешняя палітыка была правільнай і «карэннага перагляду» ўнутранай і знешняй палітыкі не патрэбна. Разам з тым яна была «аднамернай» (мелася на ўвазе аднабаковая арыентацыя на Расію), а цяпер «стала па сапраўднаму шматвектарнай і дынамічнай». Паводле слоў прэзідэнта, «Беларусь не будзе рабіць выбару паміж Расіяй і Еўрасаюзам», што можна разумець такім чынам, што цяпер гэтыя два цэнтры сілы сталі для яе аднолькава важнымі партнёрамі, і што Масква не будзе карыстацца ў Мінска прывілеяваным становішчам саюзніка нумар адзін.

Беларускія палітычныя аглядальнікі назвалі гэта сцвярджэнне (дэкларацыю раўназначнасці дачыненняў з Усходам і Захадам) «амаль рэвалюцыяй у знешняй палітыцы», «рэвалюцыйнай зменай арыенціраў», «паваротам у знешняй палітыцы». Абвясціўшы палітыку арэляў, А. Лукашэнка разлічвае на доўгатэрміновае манеўраванне паміж Усходам і Захадам, якое ён даволі паспяхова пачаў ажыццяўляць у апошні час.

Беларускі кіраўнік зазначыў, што супярэчнасці з Расіяй з'яўляюцца ўсё больш часта і робяцца ўсё больш вострымі, за якімі часам прасочваюцца паслядоўнасць і сістэмнасць. З беларускага боку гэта выклікае трывогу, а часам боль і расчараванне. Паводле яго слоў, у палітыцы Масквы назіраецца сіндром «цяжкавагавай дзяржаўнасці» (тяжеловесной державности). Інакш кажучы, сістэмнасць беларуска-расійскага канфлікту вынікае з самой прыроды расійскай дзяржаўнасці, гэта значыць, што прычыны гэтага канфлікту маюць глыбокі, доўгатэрміновы характар. А. Лукашэнка прапанаваў пабудаваць паміж Беларуссю і Расіяй унікальныя адносіны як паміж цалкам суверэннымі і незалежнымі дзяржавамі.

У супрацьлеглым кірунку, г. зн. у бок пацяплення, хоць таксама з вялікімі цяжкасцямі развіваліся адносіны Беларусі з Еўрапейскім саюзам. У апошнія гады прэзідэнт А. Лукашэнка, канстатуючы палітычныя цяжкасці, якія існуюць у беларуска-еўрапейскіх адносінах, неаднаразова выказваў упэўненасць, што хутка гэтыя адносіны палепшацца. Час для паляпшэння прыйшоў у 2008 г., калі беларускія ўлады зрабілі некалькі важных крокаў насустрач патрабаванням ЕС: вызвалілі палітвязняў, вярнулі ў шапікі незалежныя выданні «Народная воля» і «Наша ніва».

Галоўнымі прычынамі, якія патрабавалі карэкціроўкі курсу (аб яго змене казаць яшчэ рана) беларускай унутранай і знешняй палітыкі, можна назваць наступныя: сусветны эканамічны крызіс, сістэмны крызіс у адносінах з Расіяй, неабходнасць выканання мінімальных патрабаванняў ЕС, без чаго было немагчыма пачаць нармалізацыю беларуска-еўрапейскіх адносін. Да гэтых прычын знешняга характару трэба дадаць унутрыбеларускія чыннікі: неабходнасць амаладжэння вышэйшага эшалона ўлады пры большым акцэнце на прафесійныя і дзелавыя якасці і меншым, як здаецца, на лаяльнасць (апошняя, напэўна, аўтаматычна залічваецца ў неабходныя якасці чыноўніка), змена грамадскіх настрояў на карысць паляпшэння адносін з ЕС, скарачэнне прыхільнікаў аб'яднання з Расіяй.

Найбольш значныя перамены (пакуль што тэрміналагічныя) адбыліся ў знешняй палітыцы, у прыватнасці, адносінах з Расіяй. Прызнанне беларускім прэзідэнтам «сістэмнага крызісу» ў адносінах з Масквой і тэзіс аб раўназначнасці адносін Беларусі з Расіяй і Еўрасаюзам можна сапраўды расцаніць як рэвалюцыю ў мысленні. А. Лукашэнка яшчэ больш наблізіўся да афіцыйнага прызнання раўназначнасці двух вектараў ў беларускай знешняй палітыцы — усходняга і заходняга — і неабходнасці адпаведнай гэтаму палітыкі лавіравання, палітыкі арэляў паміж Расіяй і ЕС. Разам з тым не адбылося адмовы ад канцэпцыі стварэння саюзнай дзяржавы з Расіяй і інтэграцыйнай рыторыкі наогул. Працягваюцца эклектычныя заявы аб Расіі як галоўным прыярытэце і саюзніку нумар адзін.

Апошнія пазітыўныя тэндэнцыі ў развіцці адносін Беларусі з ЕС дазваляюць прыйсці пакуль што да асцярожнай высновы, што з 2008—2009 гг. можа пачацца новы этап ў гэтых адносінах, які характарызуецца іх нармалізацыяй і пэўным пацяпленнем. Яшчэ цяжка меркаваць, наколькі гэта тэндэнцыя будзе пэўнай і ці стане яна доўгатэрміновай лініяй у павароце да лепшага ў беларуска-еўрапейскіх адносінах. Аднак і таго, што зроблена абодвума бакамі за апошнія паўтара—два гады, дастаткова для сцвярджэння, што Мінск і Брюсэль прайшлі цяжкі пачатак на шляху аднаўлення даверу, за якім могуць адкрыцца шырокія гарызонты ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

## ОТНОШЕНИЯ БЕЛАРУСИ С ЕС В КОНТЕКСТЕ ИНИЦИАТИВЫ «ВОСТОЧНОГО ПАРТНЕРСТВА»

***Тихомиров А. В.***, *Белорусский государственный университет*

7 мая 2009 г. представители 27 государств — членов ЕС, 5 государств СНГ (Армении, Азербайджана, Беларуси, Молдовы, Украины) и Грузии на встрече в Праге подписали установочные документы и декларацию о развитии политики «Восточного партнерства». В отличие от предшествующих инициатив ЕС, обращенных к странам СНГ, «Восточное партнерство» предусматривает подключение Беларуси, общение которой с ЕС и входящими в него государствами до недавнего времени было очень сдержанным.

Инициатива ЕС получила позитивную оценку со стороны белорусских официальных лиц. Принявший участие в Пражской встрече вице-премьер Беларуси В. Семашко заметил, что реализация программ «Восточного партнерства» может ускорить снятие ограничений в торговле ЕС с Беларусью, создаст новые возможности для наращивания белорусского экспорта в европейские страны, привлечения европейских инвестиций в белорусскую экономику, более активного использования транзитного потенциала Беларуси, упрощения ее визового режима со странами ЕС. В июле 2009 г. эти установки подтвердил министр иностранных дел Республики Беларусь С. Мартынов.